А. Мрый

Камандзір

(*Апавяданьне*)

— Ого! Цяпер я сьцішыўся, цяперака я ўходаваўся! Што я цяпер? Самы ціхі чалавек у вакрузе. Жонка, дзеці, жыву, як расьліна! Асеў на зямлю, ды цягну яе, як цяля карову. А калісьці я быў гэрой! Чаго вы сьмяецеся? Што?... Ці быў я на вайне? На якой?... На нашай быў! З 18 году, а было мне тады 22 гады, як лёду...

Падарожны памаўчаў, падкінуў у вагонь трусу, не сьпяшаючыся скруціў сабаччую ножку, запыхкаў моцнай махрой і пачаў нам расказваць.

— Я і цяперака, калі што будзе, дык першым у пекла пападу. Мяне, бачыце, камандзірам зрабілі.

Начлежнікі зарагаталі. Брудная сялянская кашуля, абмазаная каланіцай сьвітка, смаркаецца саматужным спосабам... Камандзір!..

— А як гэта вышла? Пераказаць, дык не дасьцё веры! Было гэта тады, як немцы захапілі наша мястэчка. Сталі яны мне папярок глоткі!

Не магу на іх глядзець, не хачу пад імі, храпаідаламі, быць. Узяў ды драла ад іх.

Еду сабе ў Бабруйск. І там нямецкія капіталісты імпэрыялізм разводзяць. Я яшчэ далей пасунуўся, а яны ўсьлед па пятах, ну, проста некуды дзецца.

Прыяжджаю я ў Клінцы. Што ты скажаш? І тут яны. А са мной ехаў яшчэ адзін пісталет, звалі яго, як і мяне, Віньнік. Толькі мяне Хвёдар па прazваньню, а яго Мартын. Цяпер няма яго на сьвеце. Загінуў у завірусе і костачак не пакінуў. Добры быў хлапец, хоць і браценьнікам мне прыводзіўся.

Распыталі мы пра нашых. Кажуць нам, што гвардзейцы тут недалёка стаяць, а дальш немцы ўжо ня пойдуць.

— Пачакай! кажа мне Мартын.—У мяне канбенацыя!

— Якая? пытаю.

— Хадзем, запішамся ў гвардзейцы!

— Што ты ачмурэў? Мы-ж ня ведаем, што ёсьць стрэльба! На сьмех ці што йсьці?

А мы з ім да гэтага часу грузавікі цягалі, з вінтоўкай ні бэ, ні мэ ня ўмелі.

— Нічога, кажа Мартын:—за спыт ня б'юць у хрыбет. Людзі ім патрэбны.

Пайшлі мы шукаць нашых. Бачым—вёска. Зайшлі ў адну хату. Праўда, гвардзейцы сядзяць, а лахматыя, мурзатыя, як мядзьведзі. Сядзяць ў чырвоных шараварах ды гуляюць сабе ў лісьцікі. На нас і вокам ня міргануць. Сваю справу робяць. А каля сьцяны стрэльбы стаяць.

Мартын мой як звар'яцеў. Цап за стрэльбу ды давай яе мацаць, давай яе круціць, кулупаць, давай яе ляскаць, што і як.

Гвардзейцы ўшчупусіліся. Хто такі? Адкуль? А, нямецкія прысьцябаі?! За мурмалку нас—і пацягнулі пад растрэл...

Ну можа не пад растрэл, а так... пажартаваць.

Я бачу, што справа, канешне, дрэнь. Давай кавярацца, гарадзіць, што папала. Аўтарытэтна заяўляю, што магу быць камандзірам дывізіі, а мяне пад растрэл пхаюць. Насьмяшыў іх. Тут і Мартын пасьмялеў, і ён

свае словы торкае. Рагочуць гвардзейцы, а тады раптам кажуць: „Ты будзеш камандірам 3 роты“. Гэта на мяне так. „А ты—кажуць на браценьніка—будзешь камандзірам пешай разьведкі“.

Так і прайзьвялі нас у чыны. А мы, ведаеце, ні бэ, ні мэ! Ні ойча наш, ні багародзіцу. Толькі, праўда, лаянкаю добра крылі. 6 месяцаў былі мы ліпавымі камандзірамі. Спачатку дужа сьмяяліся з мяне. Я і сам канстаціраваў. Які я камандзір? Ня ведаў нават, як і стрэльбу трымаць, а пра каманды ці маршы і ня пытай! А хоць і сьмяяліся, ды прызвычаіліся да мяне. Ды чаго было сьмяяцца? Чалавек за іх рабочую справу ідзе. Пачалі некаторыя з іх троху падвучваць мяне, падраўноўваць. Так з грахом папалам трымаюся ды баюся, каб за шкірку ня выштурхнулі.

А тут, на табе, чэхаславакі! Мяне фурць на тэй фронт, з усёй маёй басатэрыяй. І Мартына таксама. Еду, а сам думаю сабе, як я там буду ваяваць, як буду камандаваць. Гэта-ж ня жарты! Усунуць гарматы, кулямёты, што я буду рабіць? Ня сплю ночы, як еду ў цялятніку. Усё думаю: правалю рэвалюцыю!

— Праваліў, ай не?

— Не праваліў! Страляем, па чым папала! Якая там каманда! Айдзе ўсе, там і я! Вочы ў мяне зіркія, як у арла! Пабачу, як крадуцца белыя, ды камандую па-свойму: Ото-то! Ото-то! Вунь, вунь! Лупцуй яго! Клей яму ў... Вунь яшчэ паўзуць! Перанось туды агонь! А сам авангардам лезу на ражон.

Адным словам, ня быў трышкай! Вясёла было хлопцам са мной.

Аднойчы абадралі мы нейкага пана. Паадбіралі ў яго ўсё чысьценька, што трэба, што й ня трэба! Наша часьць сабрала 12 грамафонаў. А тут белыя насядаюць. Мы паставілі грамафоны на калесы, закруцілі іх, ды ў атаку. Во сьмеху было! Белыя аж аслупянелі, як мы з грамафонамі тарарахалі. Далі дзёру яны. Усё я быў завадатай. Мартын так і дражніў мяне „грамафоншчык“.

А яшчэ скажу вам, я з ліпавага камандзіра вышаў на чырвонага ахвіцэра. Можа мяне трэба было тады ліквідаваць. Нарабіў я бясчынства, ой-ёй-ёй! Цэлы кодэкс парушыў, пад касьцёл шмат каго падвёў. Толькі і пашкадавалі мяне за мае маладыя леці ды паслалі падвучыцца.

Падарожны азірнуў усіх, хто сядзеў каля агню, як быццам хацеў пераканацца, ці ўважліва яго слухаюць, і потым, гледзячы на вогнішча, загаварыў:

— Стаялі мы пад Кунгуром, біліся некалькі дзён, а як перайшлі яго, дык і далі нам два дні падправіцца. Адна беспартыйная баба, гадоў так пад 70 будзе, перадала нам на вуха, што тут недалёка ёсьць маёнтак генэрала Уварава. А стаіць ён у пушчы-драмушчы. І там можна таго-гэтага здабыць. Ну, першым чынам узяліся мы правесьці там каналізацыю, бо ў нас коні ўсе былі ануліраваны, дык мы задумалі забраць генэральскіх коняй.

Што ж? Сьмела ідзем туды. Валім проста на стайні, а бяз ніякага дакладу. Бачым—нейкі прыстаўны самасуй не дае нам праходу. Кажа: „ідзеце да генэрала, а я ні пры чым!“ Мы на яго як цыкнулі: „што ты, лупі тваю прасьвятую, чужога добра сьцеражэш! Стражнік знайшоўся?“, У хрыбет яго. Той перакуліўся ды драла ад нас.

Толькі пачалі брацца за коняй, а генэрал толькі гэтага і чакаў. Сьвіснуў у сурчок, а выскачылі няма ведама адкуль, сабакі і давай нас рэзаць, давай нас шкамардзіць. Аж пер'е ляціць з нас. Мы адбівацца. Толькі дзе там? За самыя кволыя месцы хапаюць...

А было гэта перад вечарам. Сам генэрал выйшаў на ганак, сьмяецца, а ўсьмешка яго проста як у вакулы імпэрыялізму. Што нам рабіць? Хоць круць верць, хоць верць-круць, дык больна выходзіць.

Крычу я а не сваім голасам: „Душу табе расьпятушу, калі ня ўсьцішыш сваіх ваўкарэзаў“. А ён злосна сьмяецца ды крычыць нам, як з трубы трубіць: „Вы мне свабодна можаце ня указваць, хамуйлы! Чаго вы тут? Вон адгэтуль! Гэта маё дабро!

Узарвала мяне гэта панская працадура. Стрэліў я ў генэрала. Не папаў! Схаваўся ён у дом, прытаіўся каля вакна ды з леварвэртам падсьцерагае. Бачым мы: справа зноў дрэнь! Зноў у нас кампотны настрой! А сабакі намэтлахі разносяць нас, без дзяцей пакідаюць... Давай мы іх чысьціць ды патроны на злыдняў траціць. Як ніяк разагналі, а каторых перабілі. А трох з нас моцна паскублі—у шпіталі адлежваліся.

Узяліся мы за генэрала. Уварваліся ў яго логава. Пан дрыжыць, як у трасцы, чуе, злодзей, што не здабраваць яму.

Абкруцілі мы рукі яму... Як цяпер бачу я генэрала гэтага. І пагоны і ўсе на ім было. Як відаць, не пасьпеў зьбегчы. Клусны быў, як кабан, твар чырвоны, вочы маленькія, зьлючыя, калючыя, як у восвы, ды яшчэ тры падбародавічы.

Заляпіў я пану поўху, аж зашчочына пачырванела. А пасьля троху аддыхаўся і сказаў яму слова моцнае:

— Слухай ты, анцімонія чэхаславацкая—так гаварыў я—слухай ты, гадава яйцо! Мы нічого не зрабілі-б табе, мы абышліся-б конкрэтна і далікатна, каб ты не захацеў згубіць рэволюцыянэраў. А ты ваўкарэзаў нагнаў на нас, пачаў нас сабатажнічаць. Кружануў яго яшчэ разы тры лаянкаю. Душа з мяне парастоўпам выходзіла ад злобы. У канцы крычу яму: „Досыць вам, паночкі! Наёрзаліся вы на нас, наёрзаемся і мы на вас. Сухапутныя чэрві вы! Раздавім мы вас без жальбы.

Схапіў я генэрала за карак, ды што моцы грук яго аб зямлю.

Тут раптам уваходзіць генэралава дачка. Браткі мае! Што тут зрабілася са мною! Пацямнела ў ваччу. Такой красы я ня бачыў. Уся ў белым, як малінка, а вочы, вочы ярыя, ярыя, бліскучыя! З пагардай пазірае на нас. У мяне і язык адсох.

Кажу ёй: „Мы не хацелі вам зла рабіць, а ваш генэрал-айцец неблагародную структуру замысьліў, і мы ня можам гэтага так кінуць. Генэрал ваш адкажа перад рэвалюцыяй і намі. Не памрэ ён сваёй скорай сьмерцю.

Паненка ўся задыхаецца. „Вы бандзісты“, крычыць. „Што вам тут трэба? Чаго вы ўварваліся ў наш дом?“. Тупае на нас нагамі.

А я, як камандзір, галянтарэйна кажу ёй: „Дом ваш цяпер ужо наш, і ўсё ваша будзе наша“. Давай ёй палітграмату чытаць. Але яна ня слухае, а сваё буржуйскае трубіць. За кожным словам джала торкае, ды зачапляе нас за жывое. Вядома, зьмяіны выпаўзак, дык і джыгае.

Гляджу я на яе, ды любуюся. Вочы гараць і цягнуць да сябе, як сьмерць ці прадоньне. Думаў я скалатушыць генэрала, ды дачка прыйшлася ў панараў.

Загадваю сваім хлопцам: „Засадзеце генэрала ў каморку якую, ды на замок зачынеце, каб ня выдраўся, а заўтра мы будзем судзіць яго судом рэвалюцыі і сьмерці“. Пасьля маё войска разьмясьцілася па пакоях, дзе два, дзе тры чалавекі. А пакояў шмат было.

А сам я пашоў з генэральскай дачкой аглядаць усё. Што ж? Яна, сьцяўшы зубы, паказвае мне ўсё, тлумачыць, што, як і айдзе пакладзена. Мяне і сон ня ўсіляе. Гляджу на яе, ды дзіўлюся яе маладосьці ды зграбнасьці. Павяла яна мяне яшчэ ў сад. Праўда, я з рэвальвэртам іду: а можа пастка якая на мяне нарыхтавана. Не! Нічога! Ходзім мы па сьцежачках. А па траве шмат было іванавых чарвячкоў. Яна ўсё пазірае на агоньчыкі,

ды нешта думае. На мяне не глядзіць. А я ўсё роўна, як у вагні. Чую, як кроў булькае, гарачым комам падхлынае да сэрца. Усё цела напружваецца. Але стрымліваюся і вяду палітычную разгавору. Пачынае і яна гаварыць. Пытае мяне, дзе я жыву, у якім месцы і ці вялікае протэжэ ад майго дому.

А ўсе словы свае пераводзіць на тое, каб мы з бацькам яе нічога не зрабілі.

Я ёй заяўляю: „Калі вы так просіце, дык можна зрабіць зьніжэньне: даць 3 ці 4 гады сьмерці ў турме, а нічога не прысудзіць нельга“.

Яна бача, што я падаўся, ды яшчэ просіць мяне, а вочы так прыхільна, з абяцанкай, пазіраюць на мяне. У мяне сэрца так і ёкае, тыхае, як матор.

— Пайка яго, што вы так кажаце. Каб ня вы, прапаў бы бацька ваш. Бяру паненку за руку ды кажу: „Толькі ведайце, што кожны па сваіх смысьлях схапвае, і вы павінны гэта памятаць“.

А яна перабівае разгавору, каб я не дагаварыўся, ды кажа: „Хадзем у дом—будзем гарбату піць“. Што-ж? Мне і ня хочацца, але ідзём.

Заходзім у яе пакой. Чалядка прыносіць гарбату. Усё так чыста, прыгожа, шклянку дае на бліскучай падносе.

Выпілі мы чай. Я заводжу зноў палітычную разгавору. Скуль і словы ў мяне бяруцца. Пытаю: „ці няма ў вас Ямелю Золю прачытаць? Я вельмі люблю прастуджваць сябе літаратурай. Яна ўсьміхаецца: „Не! Ямелі Золі такога ня чула. А што вы чыталі яго?“ А я, братцы, яйбогу, нічога ня чытаў, ніякіх літаратур. Пачырванеў троху, ну ня дужа.

Гаворым мы з ёй такім чынам. Страшэнна мне хочацца любезнасьці гаварыць ёй ды гладзіць яе, як піскляняка. Такая была прыгожая ды ўборная! Пад канец нейкая шайтанская сіла ўсьсела на мяне. Нічога не зраблю з сабой—душа стала хацімая.

А было позна ўжо. Людзі паўспаліся. Самы сон. Цішыня вакол.

Я і падсунуўся да яе. Паненка ні божа мой, крычаць хоча, адбіваецца, як замахнецца белай ручкай—усё ў месяц мне пападае. Валтузіўся я, валтузіўся з ёю. Бачу—незмага па добраму ўзяць. Падамнуў яе ды нахрапам дабіўся свайго. Зусім зьнямог, аж запышку нагнаў. Нічога ня ведаю, дзе я і што са мной. Усё цела томнае, і жывот томны. Ляжу, як няжывы.

А паненка плача, раве, як ваўчыха. Раптам трах—разарвала на сабе сарочку, ды кідаецца ка мне, кусаецца, статуямі швыргае ў мяне. Я супакойваю:„Што ты сшыманела, дзевачка? На што ты сарочку пашкуматала? Людзі сьмяяцца будуць! Шустра ты, паненка! Хочаш з печы зваліцца і сядзелкі не пабіць“. Так па-мужыцкаму і кажу ёй. „На тое рэвалюцыя, кажу. Ня толькі мы пакутаем, а і вы, паночкі, жыцьцю будзеце ня рады. Ня будзь сярдуньняй—пераходзь да нас. Будзем жыць з табой, а не, дык усё роўна будзеш праз наш кій скакаць“.

Паненка зьдзіка зарагатала, вочы загарэліся: „Ніколі гэтага ня будзе! зьняславіў ты мяне, і я адпомшчу. Ня будзеш ты жыць, хамуйла!“ Хоць і лае мяне, а шкада мне паненкі. Супакойваю яе:„Дос табе! Ці ты яшчэ не нарвалася? Падумаеш, вялікую шкоду зрабіў я табе! Усё пройдзе, а мы застанемся. Зробленага ня вернеш. Прырода такая мая. Сам ня ведаю, як праштрапіўся. Мужчына я, а ты такая прыгожая“. Зноў пачаў з ёю шурды-мурды.

Яна маўчыць, толькі сьлёзы ціха коцяцца. Можа ўсё і абышлося-б. Але тут і вышла катастрофа. Генэрал выдраўся з каморкі, нехта выпусьціў яго. Ляціць проста да нас. Як убачыў ён усё, ды ў чым дачка яго—страшэнна зьёрчыўся, пагнула ўсяго, што жудасна глядзець. А тады схамянуўся, выхапіў рэвальвэрт ды бац у мяне. У руку мне загрэў.

А я і забыўся, куды дзеў свой рэвальвэрт, як падаў за паненкой. Баба каму галаву ня скруціць? Адчай на мяне найшоў. Кінуўся я да пана, бац яго галавой у пуза, а рукой за аружжа ды лоўка адабраў. Пан усьсеў на мяне, перакурдыкнуў мяне. Здаровы быў, як кабан. Падкорчыў мяне пад сябе, ды ўсё ляп ды ляп па ўсяму абліччу, содзіць як капусту. А сам пыша, як жарэбны воўк.

Тут і дачушка падскочыла, б'е мяне пантофляй па твары, па пузе ды па чым прыдзецца. Зьбіваюць мяне на катлеты. Кампотны ў мяне настрой. Ніякай дынамікі ў мяне. Рэвальвэрт не аддаю, а ўзьвесьці сабачку няма магі. Але як-та напружыў усю моц, ды стрэліў. Пана ў нагу чыркануў. Той на момант адскочыў, а я яшчэ раз—прамазаў. Тут шчасьце маё, што хлопцы пачулі страляніну, ды двое з іх мяне ратаваць.

Схапілі мы генэрала, зьвязалі яго вяроўкамі, а дачка ўцякла, схапіўшы мой леварвэрт. Дзе яна яго знайшла—ня ведаю.

Як зьвязалі пана, добра я насьмяяўся з яго. Прыплюснуў адно вока ды кажу яму: „Што? Не па носу прышлося, як мужык тваёй дачкой пакарыстаўся? Толькі я не хацеў гэтага. Яна сама. (Кажу так, каб больш раззлаваць яго). Прырода, пане, нічога ня зробіш Ты сам прычынны ў гэтым. Так кажу яму. Пан аж сінее ад злабы. Даю яму яшчэ фігуру савецкую пад нос, абы толькі насаліць.

Руку мне перавязалі. Ные праклятая—косьць, як відаць, зачапіў.

Абкружылі мы ўвесь дом, давай парадак наводзіць. А дачка яго залезла ў пакойчык за вакешкам на калїдор ды страляе ў нас адтуль—нельга прыступіцца. Як звар'яцела. Двох з нашых, што першымі пасунуліся, паклала на месцы. А патронаў пры маім аружжы было штук 40. Ну, бачу, справа дрэнь. Узяў я гранатку 7-хунтовую, ды бэнц у вакешка. Там ад яе мокра зрабілася.

Праўда, як забіў я яе, усё ў сярэдзіне ў мяне захаладзела, як быццам адарвалася што. Такая яна была прыгожая, маладая.

Прыходжу да генэрала. Ляжыць скручаны па руках, па нагах ды плюецца крывёю. Кажу: „Дачка твая ануліравана! Цяпер твая чарга. Павядзём цябе ў падзямельны аддзел". Хлопцы як крымзанулі пана, з таго й дух вон. Як у песьні пяецца: „труп яго сьвежы зарылі ў тую злавешчую ноч". Ну толькі гэта было, як разьвідняла. Сонца выкатвалася.

Пачалі мы дапытвацца, хто выпусьціў пана, адкуль у яго аружжа. Дабіліся, што прыслужнікі былі ў прычыне, асабліва тая вастраносая, што нам гарбату падносіла. Узялі мы яе на рэмус. Пыталі ў яе дзе яна ў тэй час была, ну а яна адказала: „гэта душэўная тайнасьць мая". Ну, мы і яе не пашкадавалі. Ды яшчэ двох-трох пакрыўдзілі. Адным словам, нарабілі мы бясчынстваў. Канешне, хто ў гэтым вінен? Камадзір! Пераканаліся, што камандзір я бяз усякага крэда і толькі падрываю аўтарытэт рабочай і сялянскай арміі. Скінулі мяне з камандзірства, засадзілі ў турму, судзілі мяне. Суд, пабачыўшы мае маладыя леці, дараваў мне, вярнуў у часьць. А там накіравалі мяне на курсы, дзе я зразумеў, які я гад быў і што няправільна разумеў усё. Цяпер мяне ўжо не паддзенеш.

Дык вось як было са мною. А вам здаецца, што я ціхі чалавек?

Агонь патухаў. У недалёкай вёсцы пачуліся пеўні. Ніхто не адказаў Віньніку на яго запытаньне.